Cana asobnaha numaru 20 hr. | Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 9 (554). | Wilnia, Niadziela 18 Lutaha 1934 h. | Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

БАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ.

У беларускім народным і грамадзкім жыцьці ёсьць цэлы рад спраў, якія, на нашу думку, усім слушна павінны быць названы баявымі і на якія трэба прадусім зварочваць увагу. Да гэткіх спраў залічаем: эканоміку, асьвету і Царкву-Касьцёл.

Аб нас ходзіць ужо пагаворка, што кожны беларус — гэта рэдактар, а прынамсі агулам палітык. У гэтай насьмешцы з нас нашых «прыяцеляў» ёсьць нямала праўды. Пакруціўся сюды-туды беларускі інтэлігент, ці кандыдат на такога, глядзіш — ужо і выдаў газэту, ды такую, што — хавайцеся народы! Скажам выразна — пераважна глупую і пустую і чужую для беларусаў духам.

Або ўзноў — паслухай гутаркі беларускіх „дзеячоў", студэнтаў, нават моладзі вучнёўскай і пачуеш між імі „разважаньні" аб палітыцы прадусім. Ды што за палітыка! Такая, што мае на ўвеце ўвесь сьвет перавярнуць да гары нагамі, ну й, ведама, гэтым яго збавіць, а як Беларусь збавіць, ды каб не пераварачваючы, — бо яе бедную, як тую рыбу на скваразде, вечна варочаюць яе «прыяцелі», — дык на гэна нашы «палітыкі» мала зважаюць. Пануе, значыцца, у нас палітыка на вырост, ці прасьцей кажучы — палітыканства, якое нікога ніколі да нічога не абавязвае і забаўляцца якім можа кожны недапека.

Гэта знак нашай някультурнасьці і адсталасьці. Паўстаў у нас перарост палітыкі і палітыканства коштам сусім відавочных, намацальных і аснаўных эканамічных і духовых патрэб і вартасьцяў нашага жыцьця.

Час ужо вялікі зразумець, што несканчатнае хлебястаньне языком ці праз паперу ці так праз паветра ў рознай «гуртоўшчыне», аб справах ня маючых нічога супольнага з намацальным народным інтарэсам, ёсьць самаабманам і — сьмеем сказаць — праступкам прад народам. У шмат разоў, ведама, ёсьць горшай рэчай, ежджаньне прыздарэньні і „без оного" на чужых возіках і на чужых коніках.

Народ наш мусіць мець дабрабыт эканамічны, мусіць мець дастатак для свайго прыроднага, нявыбрэднага жыцьця. Мусіць так-жа мець хлеб і народная інтэлігенцыя, памагаючая народу здабываць яго долю. Знача, народ наш, ідучы да свайго поўнага адраджэньня, у першую чаргу мусіць здабыць сабе ад нікога незалежныя эканамічныя падставы. Да гэтага ў нашых варунках вядзе бадай выключна ўласная беларуская коопэрацыя. Праца ў гэтым кірунку сярод беларусаў пачынае разьвівацца даволі надзейна. Вядзе гэту працу часопіс «Самапомач» і тыя людзі, што каля яе гуртуюцца. Падтрымаць гэту працу, улажыць у яе душу — першая баявая задача кожнага разумнага і чэснага беларуса.

Другой баявой, так-жа неадкладнай, задачай зьяўляецца справа беларускай народнай асьветы. Задачу гэту, ведамая рэч, найлепш спаўняе родная школа. Разумелі гэта заўсёды і разумеюць сяньня ўсе паднявольныя народы. Кожны народ, што рвецца на волю, астаткі часта натужвае сваей сілы, абы толькі здабыць магчымасьць свабодна прасьвячацца. Свабодна, кажам, гэта знача—прасьвячацца павінен народ згодна з патрэбамі нацыянальнай і сацыяльнай душы сваей і пры памачы сваей роднай інтэлігенцыі. Іншая асьвета народу, як кажа беларуская пагаворка, у лес ідзе. Вучылі нас некалі па польскіх тайных школах, па яўных маскоўскіх, вучаць і сяньня на гэтым і на гэным баку польска-бальшавіцкай граніцы; праўда, лепш гэткая асьвета, як ніякая, але асьвета, якую нам давалі і даюць белыя і чырвоныя паны нашы — далёка адбягае ад тэй асьветы, што сапраўды вядзе народ да шчасьця і волі. Мусім, знача, мець мы свае беларускія школы — ўрадавыя ці прыватныя, барацьба за якія ня можа спыніцца аж да поўнай перамогі. Інтэлігенцыя наша, асабліва інтэлігенцыя вясковая, павінна прадусім гэтым заняцца. Калі-ж перашкоды «апякуноў» перавышаюць сілы нашы, — пераходзьма ў акопы тылавыя, бярэмся за родную асьвету пазашкольную, вучэмо сваіх дзяцей і самі вучэмося ў хатах сваіх з роднай добрай кніжкі, з роднай добрай газэты. Спосаб гэта выпрабаваны. Ім карысталіся і карыстаюцца лужыцкія Сэрбы, Фляманцы, Іслянцы, Славакі і іншыя дагэтуль не дзяржаўныя народы, даючы рашучы адпор сваім ворагам; гэтым-жа спосабам карысталіся Літоўцы, Чэхі, Латышы, Эстонцы, Каталёнцы і іншыя народы, што сяньня ўжо пабудаваліся на грунце сваей уласнай дзяржаўнасьці, перамажна адкідаючы навалу сваіх ворагаў.

Справай народнай у нас асьветы займаецца Беларускі Інстытут Гасп. і Культуры, да якога ўсе зацікаўленыя ў гэтай справе і павінны зварочвацца.

А вось яшчэ адна баявая для нас і безадкладная задача. Гэта справа беларусізацыі Царквы і Касьцёла, значэньне якіх для беларускага народу аграмаднае; больш таго — яны для шчасьця і культуры нашага народу неабходныя. Аднак Царква і Касьцёл ня могуць быць параванам маскоўшчыны і польшчыны, як гэта дзеіцца сяньня. Ведама, яны ня могуць і не павінны быць так-жа якім параванам, ці прыладай беларускасьці, бо яны маюць свае асаблівыя мэты — служэньне ў народзе справе хрысьціянскай веры і маральнасьці. Ісьці-ж да гэтых высокіх мэтаў як Царква, так і Касьцёл павінны пры помачы мовы і культуры таго народу, сярод якога яню працуюць. Гэтага вымагае ня толькі звычайная прыродная справядлівасьць і звычайны прородны розум наш, але іменна прадусім навука і этыка Хрыстова, а такжа, апёртая на Хрысьце навука Царквы і Касьцёла У нас, на жаль, робіцца наадварот. У нас большасьць духавенства як праваслаўнага, так і каталіцкага паступае нязгодна з хрысьціянскай навукай, а згодна з тэй чужацкай палітыкай, з якой яно такую ці іншую карысьць мае. Аб гэтым і аб сваіх правох беларусы праваслаўныя і каталікі «свайму» духавенству павінны прыпамінаць аж да канца. Ёсьць і на гэта спосабы: зьбіраць масавыя подпісы на просьбах сваіх і слаць іх да вышэйшых духоўных уладаў. Астануцца гэтыя ўлады глухімі — ударыць духавенства па кішані, ня даць яму пад ніякім відам ніякай грашовай платы і ніякай іншай дапамогі. Не паможа і гэта — ня слухаць у польскай ці расейскай мове казаньняў, на той час выходзячы з сьвятыні; урэшце ў чужой мове ані пытацца аб чым духоўнага, аніяму адказваць, калі б пытаў нас па чужацку.

На пульсе гэтай справы трымае руку Беларускі Нацыянальны Камітэт праз свае Камісіі—Праваслаўную і Каталіцкую, у якія павінен зварочвацца кожны, хто працуе дзеля справы беларусізацыі Царквы і Касьцёла.

Словам, баявымі беларусаў задачамі сяньняшняга дня зьяўляецца безагляднай барацьба за сваю ўласную эканаміку, за сваю асьвету і за сваю родную Царкву і Касьцёл.

Z hazet.

Wodhuk maskoŭskaha teroru ŭ BSSR. na bačynach „Dzien. Wilen."

Adnosiny wilenskaj polskaj endecyi na čale z „Dziennikam Wilenskim" da biełaruskaha narodnaha adradžeńnia ŭsim wiedamy: niama biełarusaŭ i być nie pawinna. Dyk woś „Dzien. Wilenski" (Nr. 37 i 38—1934), šyroka apiswajučy maskoŭski teror ŭ Usch. Biełarusi i ździek čyrwonaj Maskwy nad biełaruskim narodam, u kancy z peŭnaj dozaj zadawaleńnia ćwierdzić: „Niezaležnaja Sawieckaja Biełaruskaja Respublika walicca i pad swaimi razwalinami pachawaje apiača, mnohich achwiar, u postaci biełaruskich nacyjanalistaŭ, uwieś biełaruski narodny ruch u Sawietach."

Biespadstaŭnaje heta ćwierdžańnie „Dz. Wil.", bo-ž nia ŭsio tak bywaje, jak chočacca. Strach bieł. narodnaha adradžeńnia spanukaje da takoha dzikaha teroru čyrwonuju Maskwu suproć biełaruskaha narodu. Wаrožy da siabie nastroj biełaruski narod z abudwych bakoŭ nia pieršy hod i nia pieršuju sotniu hadoŭ adčuwaje, adnak žywie i ŭ apošnija pawajennyja hady biazupynna damahajecca naležnaha sabie prawa ŭ siamji wolnych narodaŭ. Biełaruski narod praciarpieŭ nia hetulki, pracierpić i hety prašled.

Imianinowyja pažadańni „Dziennika Wilenskaha" arcyb. Jałbžykoŭskamu.

Na imianiny arcyb. Jałbžykoŭskaha „Dz. Wil." dałučyŭ swajo „haračaje" pažadańnie, kab najchutčej i najbolš pa myśli ździejśnilisia tyja wialikija namiery, jakija pastawiŭ sabie Wysokadastojny Archipastyr na wysokim i adkaznym stanowišču ŭ našaj archidyecezii." („Dz. Wil." 7.II 34).

Pišučy hetak „Dz. Wil.", widać, dobra znaje „tyja wialikija namiery," jakija maje arcyb. Jałbžykoŭski i z imi, widać, całkom zhadžajecca. Lohka dahadacca, što hetyja „namiery" nie adnosiacca wykļučna da relihijnaha žyćcia, jakoje ŭ čystym wyhladzie nia maje dla „Dz. Wil." wialikaj wartaści, a adnosiacca jany tak-ža da žyćcia nacyjanalnaha. A jak „Dz. Wil." hladzić na nacyjanalnaje žyćcio biełarusaŭ, my dobra wiedajem; mety jaho adnosna nas: apalačyć nas, kab pa biełarusach i śledu nia było. Dla „Dz. Wil." heta buduć „wialikija namiery" polskaj nacyjanalistyčnaj palityki ŭ Zach. Biełarusi, jakija prawodzić arcyb. Jałbžykoŭski praz Kaściol siarode biełarusaŭ katalikoŭ. Woś fakty hrnych „namieraŭ": polonizacyja biełarusaŭ pad firmaj katalickaj akcyi, jakaja wiadziecca tolki papolsku, pašyrańnie siarod biełaruskaj moładzi polskaj čornasocienskaj arhanizacyi S.M.P., naznačańnie ksiandzoŭ biełarusaŭ na polskija parafii i h. d. Hetyja fakty świedčać, što mety „Dz. Wil." i arcyb. Jałbžykoŭskaha adnosna biełarusaŭ adnolkawy. Z.

U zali Biełaruskaha Instytutu Hasp. i Kultury, Wilnia Zawalnaja wul. 1—1 dnia. 25 lutaha 1934 h. adbudziecca

WIEČAR

pryświačany 5-tym uhodkam wydawiectwa „Šlachu Moładzi".

U prahramie wiečaru:

1. Sprawazdaŭčy referat z dziejnaści Red-kal „Šl. M." za 5 h.
2. Biełaruskija Narodn. Pieśni ŭ wykanańni Bieł. Choru pad kiraŭnictwam hram. Al. Stepowiča.
3. Solo na skrypcy.

Uwachod wolny. Pačatak a hadz. 19.

Dzień Litoŭskaj Niezaležnaści.

16.II. skončyłasia roŭna 16 hadoŭ, jak Litwa abwieščana Niezaležnaj dziaržawaj. 16.II—heta dzień, ad jakoha Litoŭski Narod pačaŭ swajo dziaržaŭnaje budaŭnictwa, katoraje siańnia pamysna wykončawaje i zawiaršaje. Dzień hety — heta sapraŭdy wialikaje świata Litoŭskaha Narodu. 16.II. jak na hety, tak i na toj bok litoŭska-polskaj hranicy, jak u rodnym krai, tak i na emihracyi: u Amerycy, u Łatwii i inšych krajoch Litoŭcy światkujuć z wialikaj pawahaj i ŭračystaściaj.

Zrazumiełaja adnak reč, što dzień 16 II. Litoŭcy najbolš uračysta światkujuć u Litwie Niezaležnaj. Tam, jak padajuć litoŭskija hazety, u hety dzień pa miestach i miastečkach na ŭsich damoch pawiawali narodnyja ściahi, a na balkonach i woknach widniełasia Pahonia, patrety Prezydenta i patryarcha litoŭskaha adradžeńnia Basanowiča. Zrańnia pa ŭsiah kaściołach, — a takža i pa światyniach niekatalickich — adbyłosia ŭračystaje nabaženstwa za pamysnaść Litwy. Asabliwa-ž uračysta dzień litoŭskaha narodnaha świata byŭ adznačany ŭ Koŭnie.

Nie astalisia takža ad swaich bratoŭ u Niez. Litwie i Litoŭcy ŭ Wilenščynie. Tut takža pa ŭsim krai, dzie žywuć Litoŭcy, u dzień 16.II. adbywalisia rožnaha rodu ŭračystaści, jak nabaženstwy, schody, lekcyi, pradstaŭleńni i inš. Hałoŭnym-ža tut asiarodkam litoŭskaha narodnaha światkawańnia była Wilnia. A h. 10 u kaść. św. Mikałaja adbyłosia ŭračystaje nabaženstwa, na jakim strojna piajaŭ chor, adpawiednaje było kazańnie i poŭna było narodu. U toj-ža dzień wiečaram a h. 8 u sali Litoŭskaj Himnazii im. Witaŭta Wialikaha adbyłasia ŭračystaja akademija. Ustupnoje słowa skazaŭ Staršynia Litoŭskaha Tymčasowaha Kamitetu K. Stašys, padčorkwajučy značeńnie Dnia Litoŭskaj Niezaležnaści dla litoŭskaha narodu jak u sučasnaści, tak i ŭ budučynie. Paśla byŭ pryhoža pradstaŭleny žywy abraz, pa jakim nastupili litoŭskija pieśni, jakija krasoj swajej čarawali poŭnuju ahromnuju salu prysutnych. Byli takža prywitańni ad biełarusaŭ i ŭkraincaŭ. Ad. Bieł. Nac. Kamitetu witaŭ Litoŭcaŭ zastupnik staršyni K-tu pasoł F. Jaremič, padčorkawajučy nieabchodnaść jak dla Biełarusaŭ, tak i dla Litoŭcaŭ biełaruska-litoŭskaha sužyćcia i ŭzajemnaha maralnaha padtrymańnia, zaznačajučy adnačasna, što sprawa heta raźwiwajecca pamysna i štoraz bolšaje znachodzić zrazumieńnie jak u Biełarusaŭ, tak i ŭ Litoŭcaŭ.

*

Ad dnia abwieščańnia Litoŭskaj Niezaležnaści minuła 16 hadoŭ. Čas heta ŭ žyćci ludzkim niewialiki. Adnak skolki-ž ludzi za hety čas mohuć dakanać dobraha! Pryhožym hetaha ŭzoram słužyć Litoŭski Narod, jaki za 16 hadoŭ hetak mnoha dakanaŭ na niwie swajho narodnaha i dziaržaŭnaha budaŭnictwa. Litwa siańnia abjadnana ŭžo ŭ swajej rodnaj dziaržawie, za hranicami jakoj astałasia tolki mienšaja častka jaje. Narod Litoŭski siańnia sam twora dabrabyt sabie, swaju kulturu, pamysna raźwiwajučysia dalej na adradženskaj narodna-palityčnaj darozie swajej.

16 hadoŭ tamu—tolki miesiacam paźniej — i my Biełarusy abwieścili swaju niezaležnaść. Praŭda, rožnyja i mnohija pryčyny nia dali nam zdabyć henaj niezaležnaści. Adnak narod naš da jaje imkniecca i prydzie čas, kali i jon swaju dolu woźmie ŭ swaje ruki. Stacca heta moža raniej, jak kamu zdajecca.

Maralnaj zarukaj i pryhožym uzoram našaj niezaležnaści słuža nam niezaležnaść litoŭskaja. Uzajemnaje-ž, zhodnaje sužyćcio i padtrymańnie hetych narodaŭ—heta nieabchodnaja wymoha samoha žyćcia jak dla adnej, tak i dla druhoj starany.

Darohi Biełarusaŭ i Litoŭcaŭ i los ich schodzilisia ŭ minuŭščynie — zyducca jany i ŭ budučynie. U Krai našym, dzie nawat polskaja statystyka naličaje Litoŭcaŭ 80 tysiač, a jakich jość peŭnie-ž značna bolš, spatykajucca i kryžujucca (ziemli Zach. Biełarusi i Uschodniaj Litwy. Uzajemnaje zrazumieńnie, dawier, palityčnaja sapraŭdnaść, dakanajuć taho, što dwa susiednija narody — Litoŭcy i Biełarusy zaŭsiody spakojna i družna buduć układać swaje susiednija adnosiny. Prydzie čas, kali wolnyja narody— Litoŭcy i Biełarusy — a da supałki z imi i Ukraincy — kožny na swajej ułasnaj ziamli, budawać buduć swoj dabrabyt, swaju kulturu, swajo ščaście. Prydzie čas, kali ideja Witaŭta Wialikaha ŭwaskreśnie i kali Bałtyk i Čornaje mora buduć i dla wolnaj Biełarusi darohaj u daloki świet.

Praŭda, siańnia rožnyja worahi našych narodaŭ, — aboj prosta damarosłyja palityki—časam strašać Biełarusaŭ Litoŭcami i Ukraincami, a Litoŭcaŭ Biełarusami. Ale-ž wiedama kožnamu, dziela čaho heta robicca. Dyk jasna, što hetakim „palityčnym“ nawiewam jak Biełarusy, tak i Litoŭcy pawinny rašučy dać adpor.

*

Susiedniamu i bratniamu Litoŭskamu Narodu ŭ dzień jaho wialikaha narodnaha świata wyražajem swaje ščyryja pažadańni dalejšaha pamysnaha raźwićcia na jahonym histaryčnym šlachu!...

M. B.

Aryšty Litoŭcaŭ.

Hetymi dniami administracyjnyja ŭłady aryštawali: u Wilni 3 litoŭcaŭ, u Wil.-Trockim paw. 4 i ŭ Swiancianskim paw. 17. Aryštawanych padazrajuć u nielehalnym nawučańni palitoŭsku litoŭskich dzieciej u prociŭdziaržaŭnym duchu.

З царкоўнага пагосту.

Аб беларусізацыі Царквы агулам.

Апошнімі часамі, асабліва з сёлетняй восені, дамаганьні праваслаўных беларусаў унармаваньня царкоўна-рэлігійнага жыцьця, даволі моцна ўзрасьлі і пашырыліся. Дзеля гэтага прыходзіцца аб гэтай справе ня мала пісаць у газэце. Пры гэтым трэба сьцьвердзіць, што сярод праваслаўных беларусаў пачалося ўжо змаганьне з маскоўшчынай і масквафільствам, а гэтае змаганьне якраз і натрапіла на цьвярдыню маскоўшчыны на Беларусі—у царкоўна-рэлігійным жыцьці праваслаўнага беларуса. Аб акцыі праваслаўных беларусаў супроць маскоўшчыны ў Царкве сьведчаць пісьмы беларускіх царкоўна-грамадзкіх дзеячоў, друкаваныя ў беларускай прэсе, пэтыцыі міран да духоўных уладаў, урэшце спэцыяльныя благачыньніцкія сабраньні сьвяшчэньнікаў, псаломшчыкаў ды царкоўных старастаў, а такжа шуканьне прыхільнікаў масквафільства, каб утрымаць у царкве маскоўшчыну.

Гэта ўсё разам, акцыя і супроць акцыя, штораз шырыцца і паглыбляецца. І трэба сказаць праўду, што ўжо ня ўсе пастыры трымаюцца маскоўшчыны ў царкве, бо многія з іх ня чураюцца сваей беларушчыны і аб гэтым тлумачаць народу. Аднак ня мала яшчэ ёсьць і такіх сьвятароў, якія ня могуць забыцца „царя-батюшкі“. Але з задаваленьнем адзначаем, што гэты апошні элемэнт штораз зьмяншаецца лікам і слабее значэньнем.

Мы верым, што ў сваім часе і ўсе пастыры згодзяцца з слушнымі трэбаваньнямі міран і пойдуць ім насустрэч, але гэта наступіць тады, калі міране стойка будуць бараніць сваіх правоў.

Докшыцкія благачыньніцкія сабраньні і а. К. Дэрынг.

Барацьба праваслаўных беларусаў за ўпарадкаваньне царкоўна-рэлігійнага жыцьця аказалася такжа і на Докшыцкім благачыньніцкім сабраньні 1 сьнежня 1933 году, якая сваім рэхам разьнеслася шырока на бачынах „Бел. Крыніцы“ з дня 10.XII.1933 г. № 44, у карэспандэнцыі з Докшыц грам. Б. Дудка пад загалоўкам „Выбары дэлегата на Епархіяльны Зьезд“.

Пасьля паяўленьня гэтай карэспандэнцыі ў „Бел. Крыніцы“ аб гутарках на гэтым сабраньні, адбылося паўторна благачыньніцкае сабраньне 26.XII.1933 г., спэцыяльна дзеля выясьненьня сабраньня папярэдняга.

Наша рэдакцыя атрымала ад Докшыцкага Благачыннага копію пратаколу гэнага апошняга сабраньня, у якім выясьняецца наступнае:

1) На папярэднім сабраньні 1 сьнежня 1933 году справа ўжываньня мовы ў царкоўна-рэлігійным жыцьці сусім ня была абгаварывана.

2) Настаяцель Порплiскага прыходу а. К. Дэрынг на сабраньні супроць беларускай мовы не выступаў і ніхто з прысутных ніякіх слоў ганьбячых беларускую мову на сабраньні ня чуў. Пры гэтым сабраньне сьцьвярджае, што а. К. Дэрынг не маскаль, а беларус.

3) Што на сабраньні ня толькі ня сталася ніякай крыўды беларускай мове, але наадварот—сабраньне гэта выразіла пажаданьне, каб хутчэй быў выданы беларускі падручнік Закону Божага для школ.

Пратакол благачыньніцкага сабраньня падпісалі: Докшыцкі Благачынны Прот. Плешчынскі, прот. Недзельскі, Варфоломееў, сьвяшч. Дэрынг, Голуб, Недзельскі, Бегун, дзяк Матысяк, Старыкевіч, псал. Скалацкі, Счэнсновіч, Камылевіч, Стрэнкоўскі і Кішэня.

Пры гэтым не ад рэчы будзе адзначыць, што ў нашай рэдакцыі ёсьць пісьмы з Докшыцкага благачыння аб гэтых двух сабраньнях і іншага зьместу. Ёсьць так-жа пісьмы, выражаючыя нездаволеньне з незаслужанай прыкрасьці а. К. Дэрынгу, зробленай яму тым, што ў Порплiскі прыход апошнімі часамі Кансысторыя прызначыла а. Дэрынгу непатрэбнага яму псаломшчыка, а гэта, кажуць, таму, што быццам а. Дэрынг меў адвагу сказаць на благачыньніцкім сабраньні аб патрэбе зьмяншэньня Кансысторскага штату.

Беларуская Праваслаўная Камісія пры Б.Н.К. і а. Сьвітіч.

Надовячы прыбылі сяляне з Чэрэскага прыходу, Браслаўскага пав. у Вільню і зьявіўшыся ў Праваслаўную Камісію пры Бел. Нац. К-це, заявілі наступнае:

У Чэрэскай парафіі, пасьля паданьня прыхаджанамі просьбы духоўным уладам з дамаганьнем у Царкве пропаведзяў пабеларуску і навучаньня дзяцей рэлігіі ў школе ў роднай мове, сьвяшч. Сьвітіч пачаў зьбіраць подпісы сярод прыхаджан супроць дамаганьняў беларусізацыі царкоўна-рэлігійнага жыцьця. Сяляне цьвердзяць, што ад сваіх дамаганьняў не адмовяцца і да перамогі будуць бароцца з маскоўшчынай у царкве.

Словам, на царкоўным пагосьце займаюць адпаведнае месца і беларускія міране; беларускае праваслаўнае сялянства ўжо перастае быць этнографічнай масай, якой маскалі спрадвеку пры помачы Царквы стараюцца пашыраць граніцы вялікае Расеі. Пара ўжо духоўным пастырам стаць на чале гэтага беларускага рэлігійнага і народнага руху, замест упорыста займацца чужацкай палітыкай на шкоду сваіх прыхаджан.

А. Т.

МЫ І ЯНЫ*)

Вайна распачалася. Немцы, пасовываючыся ў глыб расейскае імпэрыі, незадоўга станулі прад брамамі сталіцы Польшчы, Варшавы. Царская Расея, вуснамі вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, заклікала польскі народ узброіцца ў паржавеўшыя ад вякоў шаломы і мячы некалі слаўных польскіх рыцараў і біцца з агульным ворагам—немцам. І гэны акт, вялізарнае гістарычнае і палітычнае вагі, прайшоў не бязсьледна. І калі палякі, астаючыся глухімі да заклікаў князя, ня ўзбройваліся „ў пакрытыя іржой мячы некалі слаўных польскіх рыцараў“, дык мелі моральнае задаваленьне, што аслаблены маскаль — адвечны іх вораг — змушаны гаварыць з „непакорными ляхами“ і лічыцца з „населеніем Привисленскаго Края“. Гэную слабасьць маскаля не абмінула польская дыплёмацыя выкарыстаць за межамі сваей бацькаўшчыны.

І калі заклікаўся „лях“ да барацьбы з „тэўтонамі“, дык зварочца з гэткім самым заклікам да беларуса і літвіна царская Расея лічыла непатрэбшчынай, пераконваючы ўсіх, што насельніцтва „сѣверо-западнаго края“, як „искони русских земель“, мусіць „безропотно умирать за вѣру, царя и отечество“.

Але вялікі балван на гліняных нагах здаўся. Расейская імпэрыя пачала безнадзейна разваліваццa і ня было ўжо сумніву, што ўваходзячыя ў яе склад народы, насільствам упхнутыя ў чужацкія межы, безпаваротна парвуць лучнасьць з Масквою. І з першых днёў рэвалюцыі 1917 году пачалася новая эра ў жыцьці паняволеных народаў, даўна прагнучых свайго вызваленьня. Калі польскі народ, акрылены надзеямі, забраўся да адбудовы сваей бацькаўшчыны, дык і другія народы, у тым ліку і беларускі, не сядзелі пасыўна, а выпярэджваючы адзін другога рваліся да працы.

І аднаму з першых удалося польскаму народу адваяваць і замацаваць за сабою даўна жаданую волю і незалежнасьць. І здавалася, што з мамэнтам ускрашэньня Польшчы аджывуць, згубіўшыяся ў недалёкай мінуўшчыне, брацкія адносіны беларуса і паляка. Беларуская дэмократыя, верная сваім ідэалам, заўсёды спагадліва адносячыся да імкненьняў польскага народу, спадзявалася, што ён, ужо здабыўшы волю, працягнець беларускаму народу руку помачы і не захочыць ягонай крыўды.

Кінуты тагачасным начальнікам польскае дзяржавы заклік да жыхароў б. Вялікага Княства Літоўска-Беларускага, што займаючы іхныя землі і выганяючы з іх межаў маскоўскага бальшавіка, будзе ўважаць гэтых жыхароў, як „вольных і роўных“, выклікаў надзею і веру сярод часткі беларускае дэмократыі, што беларускі народ, ня здолеўшы яшчэ здабыць сваей незалежнасьці, знайдзець цяпер сярод польскае дэмократыі спагадлівасьць і помач. Але першыя адносіны „лепшых сыноў“ Польшчы ў аслабоненай ад бальшавікоў частцы Беларусі змусілі беларускую дэмократыю да перагляду сваіх, датуль малакрытычных, адносін да польскае дэмократыі. Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, працу якой не пасьмеў спыніць нават жаўнер кайзара Вільгэльма, акупацыйная ўлада камісара „усходніх зямель“ па загаду Варшавы ня толькі спыніла працу гэнае найвышэйшае ўстановы Беларускага Народу, алей разагнала яе, укінуўшы паасобных яе сяброў у менскі вастрог. Гэта быў адзін з першых актаў беларуска-польскага „паразуменьня“, які, нажаль, не ацьверазіў тае часткі беларускага грамадзянства, якое шукала дружбы з польскай дэмократыяй. За актам разгону Р.Б.Н.Р. наступілі другія, ня менш крыўдныя для беларускага народу, акты, падыктаваныя „лепшымі сынамі“ Польшчы ў імя „racji stanu“ палякоў на беларускіх землях, найменаваных „усходнімі землямі“ Польшчы. Цяпер польская дэмократыя не патрабавала апра-

*) (Канчатак, пач. гл. у № 8 „Бел. Кр.“)

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Соймавая прамова. Дня 7 г. м. пасол Ф. Ярэміч у польскім Сойме сказаў прамову: 1) аб голадзе на Беларусі, 2) аб правакацыі ў бел. сёлах, асабліва сярод моладзі, не выключаючы і вучнёўскай бел. гімназіяў і 3) аб зьліквідаваным беларускім школьніцтве.

Лекцыя п. Луцкевіча аб „Гомане“. 11 г. м. п. А. Луцкевіч прачытаў лекцыю аб газэце „Гоман“, якой мінае сёл. 50 гадоў. Лекцыя сапраўды магла-б быць цікавай, каб аўтор замест даказваць, што Каліноўскі быццам нічога ня меў супольнага з беларускай ідэяй і што Фр. Багушэвіч ня ёсьць патрыархам беларускага адраджэньня, а каб сапраўды ў належным сьвятле прадставіў „Гоман“. Знаючы аднак аўтора, трудна вымагаць, каб ён гэтыя справы патрапіў разважыць бесстаронна і навукова.

З выдавецкай нівы: *„Iskry Skaryny“* (№ 3, Студзень 1934, Прага). З гэтага нумару, вельмі рэдка выходзячай часопісі, выглядае, што нашы эмігранты ўжо забыліся, што ў граніцах сучаснай Польшчы ёсьць літоўцы і што яны жывуць на землях этнографічнай Літвы. Агулам гэныя „Іскры“ часта выказваюць звычайную няграматнасьць.

„Chryścijanskaja Dumka“ № 2 1934 г. Зьмест рожнародны і багаты. Беларусы Каталікі ў гэтым нумары знайдуць для сябе шмат чаго цікавага.

„Новы Шляхъ“. Вышаў № 1 за 1934 г. Ёсьць гэта орган бел. нац.-соцыял. думкі.

Z studenskaha žyćcia.

Wyjaśnieńnie:

U suwiazi z wiestkaj, padadzienaj u Nr. 3 za 1933 h. časopisu „Zołak“, ab tym „byccam Biełaruski Studenski Sajuz maje zamier wystupić z ABSA“ i što B.S.S. kryjecca z hetym pierad ABSA Urad Biełaruskaha Studenskaha Sajuzu U.S.B. u Wilni hetym wyjaśniajeć, što:

1. B.S.S. byŭ zmušany wystupić z ABSA (Abjadnańnie Biełaruskich Studenskich Arhanizacyjaŭ) z pryčyny razparadžeńnia Ministra Wierawyznańniaŭ i Publičnaj Aświety ab studenskich arhanizacyjach z 1.IV.1933 h. (Dz. U. R. P. N. 30. poz. 259), u parahrafie 27 jakoha haworycca ab tym, što ŭsie Studenskija arhanizacyi musiać wystupić z ahulna studenskich sajuzaŭ.

2. Ab hetym wystupleńni z ABSA Urad B S.S. 26.X. 33 h. wysłaŭ za N. 30 pawiedamleńnie dla ABSA. Pawiedamleńnie hetaje, jak widać z piśma da nas, z 7.XII.33 h. za N. 67 ABSA atrymała.

3. 7.XI.33. h. za N. 38 Urad B.S.S. wysłaŭ (na padstawie parahrafu 1. wyšej uspomnienaha razparadžeńnia) praz Rektorat U.S.B. zajawu da Ministra W. i P. A. z prośbaj — dazwolić dla B.S.S. iznoŭ naležyć da ABSA. Adkazu na hetuju zajawu B.S S. dahetul nie atrymaŭ.

Rewalucyja ŭ Aŭstryi — krywawaja baraćba sacyjalistaŭ z wojskam

Hetymi dniami wybuchła ŭ Aŭstryi rewalucyja. U Wienie i prawincyjanalnych haradoch wojska ŭspakajwaje socyjalistaŭ z arhanizacyi Schutzbundu. Socyjalisty zajadła baroniacca, zmahajučysia z palicyjaj i wojskam. Mnoha jość zabitych i jašče bolš ranienych. Wojska i palicyja pieramahajuć.

Pajezdka polskaha min. Bekka ŭ Maskwu.

Dnia 12 h. m. min. Bekk wyjechaŭ z Waršawy ŭ Maskwu. Z razhałosam min. Bekk wyjaždžaŭ z Waršawy ŭ Maskwu, z razhałosam jaho spatykali na hranicy i balšawiki. Na spatkańnie polskaha ministra balšawiki wysłali na hranicu swaich pradstaŭnikoŭ i dziela honaru addzieł wojska. Pajezdka min. Bekka aficyjalna maje charaktar adwiedzin sawieckaha ŭradu za kolišnija adwiedziny ŭradu polskaha Čyčerynam. Adnak heta nie zabaraniaje mnohim palitykam dumać, što heta pajezdka maje tak-ža i charaktar palityčny; adny kažuć, što heta demanstracyja byccam polska-sawieckaj pryjaźni, a druhija ćwierdziać, što hena pajezdka maje spynić hutarki ab prociŭsawieckim charaktary polska niamieckaha dahaworu. Słowam, dahadwajucca rozna. Adnak hetyja dahadki daloka ad polskaj zahraničnaj palityki nie adbiahajuć; užo jasna, što miž Berlinam i Maskwoj Waršawa wybrała Maskwu.

Niemcy ab polska-niamieckim dahawory.

Ahiencyja Hawasa padaje z Berlina: Adna niamieckaja ahiencyja, što staić blizka aficyjalnych kruhoŭ Niamieččyny, apawiaščaje, jak u Berlinie tłumačać polska-niamiecki dahawor ab nienapadzie praz 10 hadoŭ. „Ciapier možna spadziawacca, što ŭ wypadku wajny Polšča admowicca pamahać Francyi. Paśla 10 hadoŭ pretensii Niamieččyny da kalidoru z papiaredniaj siłaj buduć pastaŭleny na paradak dnia“.

Bałkanski sajuz dziaržaŭ

Hrecyja, Turcyja, Juhasławija i Rumynija dnia 4 h. m. zaklučyli miž saboju dahawor. Źmiest henaha dahaworu jašče nie apublikawany, adnak niama sumniwu, što jon maje baranić nieparušnaści hranic pawajennych dziaržaŭ, apirajučy swaje pasieliščy na Wersalskim traktacie.

Pry hetym treba zaznačyć, što Baŭharyja ŭ hety sajuz nie ŭwachodzić, choć znachodzicca na Bałkanach.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Nowy zakon, datyčačy sialanstwa. U Sojm padany prajekt nowaha zakonu ab zabiaśpiečańni ziemlarobskich rabotnikaŭ na wypadak niazdolnaści da pracy i na wypadak śmierci. Henamu zabiaspiečańniu padlehajuć ziemlarobskija rabotniki i chatniaja słužba ad 16 da 60 hadoŭ, kali pracuje ŭ adnaho haspadara najmienš 25 dzion biez pierarywu. Jasna, što hety zakon, zabiaspiačajučy niewialikuju kolkaść hetkich rabotnikaŭ, mnohich pazbawić pracy, bo zamažniejšyja haspadary, što najmajuć u padmohu parabčukoŭ, najmać pierastanuć, bo-ž treba budzie za ich płacić nowyja padatki, a hetych padatkaŭ sielanin i tak šmat maje. Dobraja heta reč, ale patrebnyja i adpawiednyja warunki

Biezraboćcie. Pawodle statystyčnych abličeńniaŭ u pačatku h. m. wa ŭsiej Polščy naličana biezrabotnych bolš 401 tysiačy asob.

Bankroctwy. Waršaŭski akružny sud śćwierdziŭ 12 bankroctwaŭ wialikich Waršaŭskich firmaŭ. Ekanamična-haspadarčyja kruhi tłumačać henaje źjawišča ŭzrostam haspadarčaha kryzysu.

Miljard zł. deficytu. U praciahu 4 hadoŭ ad 1931—32 budžetnaha hodu da nastupnaha 1934—35 dziaržaŭny budžet naličwaje bolš miljarda zł. deficytu.

Padziaka.

Urad B S.S. hetym składajeć ščyruju padziaku dla Hr.Hr. wučycialoŭ Biełaruskaj Filii Nawahradzkaj Dziaržaŭnaj Himnazii za materjalnaje, a razam i duchowaje padtrymańnie studentaŭ-biełarusaŭ, siabraŭ B.S.S.

Za Staršyniu *V. Vojtenka.*
Wilnia, 25 I.1934. Sekretar *V. Tumaš.*

Z ZAHRANICY.

Na Biełym Mory japonski flot i tajomnyja araplany nad Eŭropaj. Finskija hazety padajuć, što nad Skandynawijaj i Finlandyjaj pajaŭlajucca niawiedamyja, biaz nijakich adznakaŭ, araplany. Śpiarša heta było zahadkaj, a paśla dawiedalisia, što hetymi araplanami jeździać ahienty kominternu z Maskwy. Šwecyja pačała za hetaj pajezdkaj u pawietry śladzić i daśledziła, što na Biełym Mory znachodziacca japonskija wajennyja karabli, jakich źwierchu ahladajuć balšawiki. Słowam, balšawiki majuć strachu.

Japonija na Dalokim Uschodzie robić swajo, a balšawiki słuchajuć japonskich zahadaŭ. „Charbinskaje Wremia“ padaje: Japonski pasoł u Maskwie pastawiŭ sawieckamu ŭradu hetakija damahańni: 1) U abaznačanym časie adwieści ad Mandžurskaj hranicy skancentrowanaje tam balšawickaje wojska. 2) Zaraz-ža stwaryć kamitet pradstaŭnikoŭ troch dziaržaŭ: Japonii, Mandžuryi i SSRR., jaki pawinien ustanawić hranicy nowaj Mandžurskaj dziaržawy i źlikwidawać usie hraničnyja incydenty. Dalej „Ch. W.“ ćwierdzić, što Sawiety hetyja damahańni prymuć. Francuskija hazety pišuć, što heta abaznačaje „parazumieńnie“ miž SSRR. i Japonijaj. Adnak heta nia jość parazumieńnie, a ŭstupki balšawikoŭ Japonii, jakaja ciapier źjaŭlajecca dyktataram na Dalokim Uschodzie, prad jakoj dryžać i balšawiki.

Tannaść japonskich tawaraŭ. Hazety padajuć: Japonskija tannyja tawary zbližajucca ŭžo i da Polščy. U Rumynii 12 japonskich kašul kaštuje 20 zł 95 hr, rowar ad 20 da 25 zł., 12 par škarpetak 1 zł. 65 hr., 12 halštukoŭ 52 hr.

Z KRAJU.

U sprawie hoładu i chwarob. Hetymi dniami budzie abjaždžać haładujučyja wakolicy specyjalnaja ŭradawaja kamisija z Waršawy, jakaja maje akreślić raźmiery hoładu i ŭstanawić sposab pomačy hałodnym. Wajawodzkija ŭłady wydali zahad, kab ab pajaŭleńni zaraznych chwarob biezadkładna danosili palicyi. Za niewykanańnie hetaha zahadu pradbačycca kara.

Žydoŭskaja kolonizacyja Z Pinsku padajuć: Na Paleśsi žydoŭskaje ziemlarobskaje tawarystwa kupiła bolš 100 hek. ziamli, lesu i sienažaciaŭ dla žydoŭskich asadnikaŭ. Na wiasnu siol. maje pasialicca na Paleśsi kala 100 žydoŭskich siemjaŭ.

Miadźwiadzi na Paleśsi. Z Łuninca padajuć: Kala Łuninca ŭ lasoch znachodzicca 3 štuki miadźwiadzioŭ, jakich wakoličnyja sialanie bačyli i z jakimi spatykalisia.

Wialikaja bura. Nadowiačy nad Dzisienskim paw. praniasłasia bura, jakaja pawiarnuła mnoha telehrafičnych słupoŭ i polnych drewaŭ.

Z WILNI.

Likwidacyja pradpryjemstwaŭ. U praciahu paŭtara m-ca: ad 1.I da 15.II. u Wilni źlikwidawałasia 60 pradpryjemstwaŭ handlowych, pramysłowych i ramieśnickich.

Biezraboćcie ŭ Wilni ŭściaž pašyrajecca. — Aficyjalna statystyka naličwaje biezrabotnych užo 7000 asob.

Ukrainski Studenski Sajuz u Wilni
ładzić u niadzielu 18 lutaha 1934 h.
u Małoj Haradzkoj zali wul. Konskaja 3
ukrainskaje pradstaŭleńnie
„Oj ne chody Hryciu“
drama ŭ 5 aktach z tancami i śpiewam
M. Staryckaha
Pačatak a hadz. 20.
Ceny biletaŭ ad 49 hr. da 2 zł. 50 hrošaŭ.

нацца ў тогу лібэралізму і дэмократызму, а кідаючы ўгодлівае частцы беларускага грамадзянства ахлапіны панскага стала, консэквэнтна рабіла тое, што і яе браты шовіністыя. Апошнім, самым балючым для беларускага народу, быў акт падзелу жывога цела беларускага народу, дакананы ў Рызе ў 1921 г. Калі афіцыяльныя прадстаўнікі польскага ўраду ў Рызе ў „неафіцыяльнай“ гутарцы з недапушчанымі на конфэрэнцыю прадстаўнікамі ўраду Беларускае Народнае Рэспублікі, сярод якіх быў і аўтар гэтае скромнае стацьці, не двузначна заявілі, што ня веручы ў трываласьць беларускага адраджэнскага руху, ня будуць „tolerować“ незалежніцкіх імкненьняў беларускага народу ў межах польскае дзяржавы, яшчэ не даросшага да незалежніцкага бытаваньня. Гэтак гаварылі, нічым не засланяючыся гэтыя людзі з абозу польскае дэмократыі і да сяньняшняга дня датрымалі дадзенае ў Рызе прырачэньне.

Ад часу рыжскага міру прайшло ня шмат гадоў. Факт падзелу беларускага Народу стаўся дакананым. І ня дзеля пералічваньня нашых крыўдаў парушаемо справу польска-беларускіх адносін і ня дзеля выгавару польскай дэмократыі за гэныя крыўды, а дзеля таго, каб безстаронна разважыўшы ўзаемаадносіны польскае і беларускае дэмократыі, паставіць кропку над і і не таіць горкае праўды ад Беларускага Народу.

Перш за ўсё, на перакор жаданьням польскіх шовіністаў і польскага „дэмократычнага“ лагеру, з няскрываным задаваленьнем мусімо сьцьвердзіць, што ня гледзячы на нязносныя абставіны, у якіх Беларускі Народ жывець, беларускі нацыянальны рух ня толькі не спыняецца, але расьце і разьвіваецца; што незалежніцкія імкненьні беларускага Народу ідуць побач з нацыянальнаю сьведамасьцю, і ня гледзячы на ніщто рвецца беларус да незалежнага і самастойнага жыцьця. І сёньня можамо сьмела цьвердзіць, што ніякія перашкоды ня здолеюць спыніць гэтага імкненьня, падыктаванага нязломнаю воляю абудзіўшагася Народу. А што гэта так ёсьць — пераконваюць нас самі-ж тыя асобы, якія твораць угодлівыя беларускія шопкі ў Польшчы, складаючыяся з беларускіх рэнэгатаў і асобаў нявыразнае этычнае і політычнае вартасьці. І калі каму думаецца, што гэтыя шопкі могуць пашкодзіць і ськіваваць беларускі вызваленчы рух на іншы тор, па якому ён ужо даўна ідзе, дык мыляецца той, як мыляецца гэтак сама і ў тым, што разьбіваючы беларускі рух, унясецца дэзорганізацыя ў рады беларускіх змагароў. Жыцьцё гаворыць аб іншым, як гаворыць яно і аб тым, што ўтварэньне бел. „санацыйных“ шопак ніколі не скампрамітуець чыстага беларускага нацыянальнага руху, ідучага простаю дарогай. Ведама-ж нам, што царская Расея „купляла“ сабе людзей, заданьнямі якіх было складаць „вѣрно подданнческія благодарности“ і на парадах абавязкава крычаць „ура“! Як ацэніваўся моральны бок гэных людзей — хіба добра ведама і ня варта над гэтым разводзіцца. Сказаць толькі мімаходам трэба, што і ў „Привисленском Краѣ“, пры цары твавыліся падобныя шопкі, але, як добра ведаем, жыцьцё іх перамагло. Вырадкаў маець кожная нацыя і ад гэтага зьявішча абараніцца трудна, як трудна, ходзячы па зямлі, абараніцца ад балота. І мы не закрываемо на гэта вачэй і называемо рэчы па іменьні. Мы ня сумуемо, што беларускі вызваленчы рух ня мае спагадлівасьці; не бядуемо і аб тым, што нам адным прыходзіцца змагацца з цяжарамі і перашкодамі, якія ставяцца беларускаму Народу. Мы нязломна верымо, што працуючы і змагаючыся, дапаможамо Беларускаму Народу данясьці ягоны крыж да канечнае мэты.

А. П—іч.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры а гдзе ўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

Piśmy z wioski.

Ciemnata, biednata i epidemija tyfusu.

Daniławičy, Nawahradzkaha paw. Naša wioska wialikaja, bolš sotni chat. Žychary ūsie kataliki i pa swajej niaświedamaści nazywajuć siabie „polskaj wiery." U sapraūdnaści ūsie jany biełarusy, bo haworać pabiełarusku, piajuć biełaruskija pieśni i majuć biełaruskija zwyčai. U časie niamieckaj akupacyi adzin biełaruski wučyciel chacieū u nas załažyć biełaruskuju škołu; ludzi śpiarša i prychililisia, ale jak pačaū ahitawać prociū školy ksiondz Mieniewič, dyk i nie adkryłasia tady škoła. U našu wiosku prychodzić „Bieł. Krynica" i achwotna jaje ludzi čytajuć, čytajuć jašče achwatniej biełaruskija knižki. Załažyli ū nas polskaha „stšelca," ale ū hetaj arhanizacyi tolki sam zakładčyk i dwuch našych niaświedamych chłapčukoū. Našy chłopcy ūžo na čužyja arhanizacyi hladziać krytyčna.

Apošnimi časami pašyryłasia ū nas chwaroba —tyfus. Pryčyna: biednata, niedajadańnie i brudy. Treba praświačać našych ludziej. Wybarnyja apiakuny tolki prad hałasawańniem abiacali nam miachi ščaścia, kab kidali my numary 1 za B. B.

Daniłaūski.

„Mudryja" wybary hminnaj rady.

Dwarec, Nawahradzkaha paw. U našaj hminie adbylisia wybary ū hminnuju radu 19.I. s. h. Na wybary źjawilisia ūsie 310 wybarščykaū hramadzkich radaū. Było wystaūlena až 7 śpiskaū kandydataū u hminnuju radu. Sialanie hałasawali na swaje sialanskija śpiski. Paśla hałasawańnia akazałasia najbolš hałasoū za „adzinku," jakaja prawiała 16 radnych, a rešta ūsie śpiski tolki 4 radnych. Pa „adzincy" prajšli: wučyciali palaki, čyhunačniki, žydy i sa dwanašyja prytulnički. Wybarščyki mocna aburany na hetyja wybary. Z pasiarod apazycyjnych radnych jość i świedamyja biełarusy. Słowam, hminnaja rada ū nas ciapier sanacyjnaja i polskaja ū bolšaści, choć nasielnictwa našaj hminy 95 procantaū biełaruskaje.

Wybarščyk.

Krychu ab wybarach.

Bohiń, Brasłaūskaha paw. U nas, jak i šmat hdzie, wybary ū hramadzkija rady adbylisia biez hałasawańnia Wynikam hetkich wybaraū byli zdareńni, što całyja wioski ab wybarach nia wiedali, prykładam našaj hminy wioska Bielewičy. Dziela hetaha Bielaūcy 9 I. s. h. padali pratest. Praūda, paśla pratestu skora adbyłosia śledztwa, bo 26.I s. h. pryjaždžaū referent z Brasłaūja i dapytywaū našych wiaskoūcaū. Našy sialanie stojka stajali za praūdu i swajho pratestu nie adraklisia.

Sława Wam Bielaūcy, tak i treba zmahacca za praūdu! Ale čym heta končycca — pakulšto nia wiedama, bo ab hetym niešta zacichła paśla daprosu.

Awidaūčuk.

Dzikija pastupki ciomnaj moładzi.

Krywancy, Graūžyskaj hm. Ašmianskaha paw. U nas jašče wielmi ciomnaja moładź. Jak tolki źbiarecca ū adno miejsca, dyk zaraz i bojka pačynajecca. Hazet naša moładź nia čytaje, knižkaj nia cikawicca i tolki słužyć statystami dla polskich arhanizacyjaū: ksiandzu, wučycielu i inšym polskim arhanizataram. U hetakaj niby praświetnaj arhanizacyi moładź naša jak źbiarecca, dyk i pačynaje adzin druhomu „čyścić" zuby. Dnia 28.I s. h. było ū nas polskaje pradstaūleńnie. Sabrałasia moładź i, kab pahulać, śpiarša napiłasia harełki, a tady puściła ū chod nažy i spranžynoūki. Pačałasia nastajaščaja wajna; chłopcy z Biciun napali na chłapcoū z Wilbutawa. Samomu začynščyku z Biciun wybili zuby, a adnaho z Wilbutawa ledź žywoha pawiaźli da chaty. Hańba i styd hetaj moładzi! Treba kinuć pić harełku, a wypisać rodnuju hazetu i kupić dobruju knižku.

Tamaš.

Samaūradawyja wybary.

Dubrowa, Maładečanskaha paw. U našaj hramadzie prajšli wybary nia susim kiepska, bo choć i nia było hałasawańnia i byū tolki adzin śpisak BB., adnak prawiali ū hramadzkuju radu na 24 radnych 17 biełarusaū. U hminnuju radu mielisia być 3 śpiski, ale pawadyry pahadzilisia i stanuli kandydatami na śpisku BB. Takim čynam adbylisia i ū hminnuju radu wybary biez hałasawańnia. Wybrali 20 radnych, paławina z ich biełarusy, ale mała świedamyja. Ciapier hatowiacca da wybaraū wojta. Na hety pasad nadta mnoha jość achwotnikaū.

Janka Makar.

Našy hramadzkija balački.

W. Sukniewičy, Ašmianskaha paw. U Nr. 5 „Bieł. Krynicy" była nadrukawana karespandencyja ab baraćbie žycharoū našaj i susiednich wiosak za rodnuju biełaruskuju škołu i ab našym ciapierašnim wučycieli p. St. W. Padana było, što ū wyniku baraćby za biełaruskuju škołu žychary nie atrymali školy ani biełaruskaj, ani polska-biełaruskaj, a majem siańnia škołu polskuju, jakoj kiraūnik P. St. W. nia moža ci nia choča zžycca z tutejšymi ludźmi. Ab „karyściach z polskaj školy taksama było padana.

U wybarach u hramadzkuju radu, jakija ū nas adbylisia 14 ha listapada m. h naš wučyciel adyhraū nie małuju rolu. Peūnie-ž, „pracawaū" jon u wybarach nia dziela našaj karyści. Jeździū i chadziū jon pa wioskach, kab atrymać padpisy na deklaracyjach ad ludziej wyznačanych u kandydaty na radnikaū i ich zastupnikaū u hramadzkuju radu. Kali padpisywalisia ludzi na deklaracyjach, dajučy zhodu kandydawać u hramadzkuju radu, — dumali jany, što narod ich budzie padčas hałasawańnia wybirać. Hałasawańnia adnak nia było, a „wybary" adbylisia. Jasna, takija „wybary" ūzburyli narod. Damahańnie narodu, kab adbyłosia hałasawańnie, wybarčaja kamisija nia ūziała pad uwahu. U wybarčuju kamisiju ūwajšli amal usie wučyciali, ludzi nia tutejšyja i heta taksama narodu nie padabałasia.

Narod, šukajučy sprawiadliwaści, zaraz ža paśla takich wybaraū złažyū piśmiennuju zajawu da Ašmianskaha Starasty, damahajučysia ū joj skasawać hetyja „wybary" i wyznačyć nowyja. Na padańni zajawie padpisałasia bolš dwuch sot asob. Adnak niama na zajawu žadnaha ad jaho adkazu.

Pamima hality wiaskowaj pryjaždžaje da nas wiedamy ūsim niepažadany hość—sekwestratar, kab za zalehłyja padatki apisać jakuju padušku, chałat, koūdru i inš. rečy Taksama niatak daūna adwiedaū nas i naš świaščeńnik. Źbiraje jon mieračkaj na zwany. Maskoūščyny z carkwy nie wyhaniaje, a z mieračkaj da biełarusaū pryjaždžaje.

Toj Sam.

Z Wałožynščyny.

U 1930 hodzie ū Wałožynščynie adbiū hrad žyta. Sialanstwu pahražaū biahučy hod biazchlebicaj. Susiedzi staralisia zabiaśpiečyć swaje siemji chlebam; patrebny byli hrošy na kuplu žyta. Hrašawy hoład sialanstwa ūziałasia zdawolić Kasa Kamunalnaja. I praūda, na toj čas niby zaspakoiła hrašowuju haładoūku, ale tak niaūdała, što henaje zaspakajeńnie pawialičyła siarod sialastwa hrašowy hoład bolš čymś u trojčy. Tady henaja kasa pazyčała dawoli wialikija sumy, nawat pa 400 zł. i kazali, što henaja pazyka doūhaterminowaja. Dyk sialanie i brali. Brali i takija haspadary, što lohka mahli abyjścisia i biez pazyčki. Ale čamu nia ūziać, jana ž doūhaterminowaja, praz niekalka hadoū pa krysie wypłacicca niaūznak, a adrazu ūziaūšy hrošy, možna padprawić haspadarku. Hetak razwažali sialanie, biaručy pazyku ū Kamunalnaj Kasie. Za hetu pazyku sialanie kuplali patrochu žyta, a reštu ūkładali ū haspadarku; dobraja karowa tady kaštawała 350 zł. Ale niadoūha sialanie prawili swaje haspadarki pazyčkaj, skora pryšłosia hetaj-ža pazyčkaj ich rujnawać.

Prad pazyčkaj siaredni sielanin mieū adnu karowu, adnaho kania i hadawaū cialo Uziaūšy 400 zał. pazyčki kupiū pudoū 10 žyta i druhuju karowu za 340 zł., različwajučy, što dahadawaūšysia z cialaci karowy, pradaść adnu i padkarmiūšy sa dwuch padświnkaū, hetak pawoli praz hady tryčatyry 400 zł. spłacić nia ūznak. Adnak wyšła naadwarot. U nastupny hod. zn. u 1931 treba było spłacić tracinu pazyčki. Na hetuju pieršuju ratu sielanin pradaū kuplenuju za pazyčku karowu i jašče 2 pudy lonu. Pryšoū 1932 hod i treba było spłačywać druhuju ratu hradawaj pazyčki; sielanin pradaū swaju staruju karowu i ūkormlenaha słanińnika, a sam z siamjoj astaūsia biez małaka i słaniny. Astałasia ciałuška—na wiasnu karowa i konik, ale astałasia i tracina hradawaj pazyčki Pryšoū 1933 hod i treba było spłačywać apošniuju ratu hetaj pazyčki. A heta rata najciažejšaja, bo prychodziłasia pradawać apošniuju karowu, apošniaha kania dy i jašče astawałasia doūhu. Ale i tut Kamunalnaja Kasa pajšła na „spatkańnie:" adsročyła daūhi, zyskaūšy pracenty.

Woś jakija „karyści" dajuć hetkija „doūhaterminowyja" pazyčki sialanstwu. Jany nie ūspamahajuć sialanstwa, a tolki jaho rujnujuć. A heta tak dziejecca tamu, što niama sapraūdy sialanskich, našych, tutejšych kredytowych tawarystwaū, jakija znali-b patreby i warunki miajscowaha sialanstwa.

Sielanin.

Правакатары.

Палачаны, Маладэчанскага пав. „Бел. Газэта" разьвіваець шалёную правакатарскую акцыю ўзрываньня нацыянальна-вызваленчага руху сялян і работнікаў Зах. Беларусі. Мэта яе зусім ясная: уцягнуць як мага болей людзей у камуністычную дзейнасьць, каб пасьля вылавіць і пасадзіць за краты лепшыя сілы беларускага вызвольнага руху. Чырвоная маскоўская гідра, вылавіўшы павадыроў нац-вызваленчага руху і сьціраваўшы іх за краты сьпярша тут у Зах. Бел., а пасьля ў Б.С.Р.Р., не задаволілася гэтым. Цяпер яна працягвае свае мацкі, каб зьнішчыць перадавы элемэнт белар. сялянства і работніцтва і авангард руху моладзь (пры пасярэдніцтве „Літстаронкі").

Дзеля гэтага, граючы на самых чулых струнах душы белар. працоўных гушчаў, успамінаючы пра галіту вёскі, „Белгазэтчыкі" не падаюць аднак спосабу барацьбы з гэтымі хваробамі, не арганізуюць белар. прац. гушчаў да змаганьня за свае правы і свае найжыцьцяўнейшыя патрэбы, але ў кожным нумары сваей газэты заклікаюць правакацыйна да акцыі за вызваленьне баўгарскіх і нямецкіх камуністаў, пяюць гымны аб збраеньнях СССР і дасягненьнях сав. будаўніцтва (невядома толькі ў чым: у галіне разбурэньня сельскае гаспадаркі і давядзеньня краіны, якая перад вайной карміла поўсьвету, да голаду, ці ў галіне будаваньня турмаў і канцэнтрацыйных лагераў, разстрэлаў тысячаў работнікаў і сялян), страшаць сялянства вайной і цешаць нейкай „разьвязкай", нейкімі „набліжаючымі вялікімі гістарычнымі падзеямі, у якіх будзе вырашаны наш лёс"(?!), абліваюць урэшце брудам усіх тых, якія не пайшлі служыць за юдавы срыбнікі чырвонай Маскве.

Дарма аднак! Белар. вызвольнага руху ўжо нішто ня стрымае. Ня стрымае яго і „Белгазэта". Шкодніцкая яе акцыя таксама ня страшная, бо няма таго благога, каб ня вышла на добрае. Белар. працоўныя гушчы пераконваюцца і праканаюцца, што шчасьце сваё выкуюць толькі сваімі ўласнымі рукамі без дапамог нейкіх дабрадзеяў і не праз нейкія „гістарычныя падзеі", якія маюць прыйсьці і „збавіць" іх.

Палачанскі.

U „Бел. Газэту" praz „Bieł. Krynicu"

Pawažany Hramadzianin Redaktar! Nie admoūcie źmiaścić u wašaj hazecie nastupnaje:

My žychary miastečka Budsława i wakolicy nijak nia možam adbicca ad tak zwanaj „Беларускай Газэты", jakaja ūściaž prysyłajecca nam. Paznajomiūšysia dobra sa źmiestam hetaj hazety, my pryšli da pierakanańnia, što heta hazeta choć i nazywajecca biełaruskaj, ale źmiestam zusim nie biełaruskaja, bo wiadzie systematyčnaje raźbiwańnie jakojby nia było biełaruskaj pracy, abliwaje hrazioj usich biełaruskich dziejačoū, pačynajučy ad prawych i kančajučy samymi lewymi, jakija nia jduć na ūsłuhi čyrwonaj Maskwie, a dbajuć ab adradžeńni biełaruskaha narodu biez lakajstwa na karyść sawietaū. Inšyja hazety prosim pieradrukawać. *(28 padpisoū).*

Paštowaja skrynka.

Padpiščykam „B. Kr." Źmiaščajem Waš pratest. Pašyrajcie swaju rodnuju hazetu.

Susied. Dziakujem, skarystajem, ale skaraciūšy, bo wielmi mnoha majem karespandencyjaū.

Ša. Atrymali, dziakujem, skarystajem. U Was jość publicystyčnyja zdolnaści. Pišycie čaściej i šyrej ab žyćci i patrebach žyćcia Wašych wakolic.

Lachawicki. Karasp. atrymali, skarystajem. adnak skaraciūšy, bo ū nas brak miejsca ū hazecie. Treba raźwiwać carkoūnuju akcyju. Da hetaj raboty treba zachwočwać wieručych prawasłaūnych.

Arciuh. Wam termin na premiju pradaūžajem, źbirajcie hrošy i tady wypiswajcie.

Tutejšy Biełarus Karaspandencyju ab palitykanstwie papa-maskala paprawiūšy nadrukujem. Pišycie čaściej.

Śloznawoki. Ab budowie cerkwy nadrukujem. Pišycie bolš.

Saūka. Skarystajem, hazetu wyšlem.



Wialikaja biazpłatnaja premija!!!

CENY ABNIŽANYJA NA 70° 0.

Biaručy pad uwahu žadańni mnohich našych klijentaū my pradyūžyli da 3 sakawika 1934 h. termin, da katoraha treba nabyć u nas adzin z nižej padanych kamplektaū, kab skarystać z premijaū, pryznačanych da padziełu na luty s. h Hetyja premii jość nastupnyja: 2 žanocki palty z woūnienaj žaržez futranym kaūnieram, 2 mužčynskija walurowyja palty, 3 dywany z najbolš modnymi perskimi deseniami, 3 štuki dobraha hatunku biełaha pałatna i 2 watowyja koūdry.

Chočučy kožnamu ū ciapierašnich ciažkich warunkach dać mahčymaść nabyć hetyja kamplekty, my abnižyli ceny da niabywałaj dahetul stupieni, paimienna

Nr 1 Tolki za 11,35 zł.

Wysyłajem: 3 metry matarjału na mužčynskuju adziežu, abo na žanockaje palto, katory maje 140 cm. poūnaj padwojnaj šyryni, 1 mužčynskuju kašulu abo 1 žanockuju kašulu, strojnuju, haftawanuju wa ūsich raźmierach i kolerach, 1 paru mužčynskich nahawicaū dobraha hatunku z satynowym wykančeńniem abo 1 paru žanočych, jadwabnych, u rožnych kolerach reformaū, 1 paru eleganskich škarpetkaū, 2 mužčynskija chustački da nosa z abšytymi kalarowymi bierahami abo batystowyja žanockija, 1 mužčynski abo žanocki šalik, 1 najbolš modny jadwabny halštuk i 1 zamšowaja dziažka z pryhožaj niklowaj klamkaj da mužčynskich partok.

Nr. 2 Tolki za 11.75 zł.

Wysyłajem: 4 metry matarjału h. zw. „Lizetta" na eleganskuju žanockuju sukniu, 1 zimowuju chustku z pryhožymi kalarowymi jasnymi abo ciomnymi kratami, 1 žanocki swetrawy pullower, majučy pryhožyja kalarowyja desani (astatni kryk mody), 1 elihanskaja, waūnianaja, najbolš modnaja, žanockaja apaška, 1 madapalanowaja, strojna-haftawanaja wa usich raźmierach i kolerach, žanockaja saročka, 1 para žanockich reformaū, 1 para jadwabnych pančochaū i 3 batystowyja chustački z pryhožym ažurkom.

Nr 3 50 metraū — tolki za 25,70 zł.

Paimienna: 17 metraū biełaha pałatna firmy „I. K. Poznański" dobraha hatunku na chuścio usialakaha rodu, 10 metraū—plecienaj, miakkoj i pušystaj, u roznyja kalarowyja pałoski flaneli na chuścio, šlafroki i pižamy, 6 metraū zefiru z modnymi pałoskami na mužčynskija dziennyja kašuli, 5 metraū kanwowych firanak da wakon, majučych najbolš łahodnyja žakardowyja desani i 12 biełych ručnikoū.

Wyličanyja kamplekty wysyłajem za paštowaj zaličkaj. Płacicca pry atrymańni tawaru na pošcie. Biaz ryzyki. Kali tawar nie padabajecca, prymajem nazad i hrošy zarazža zwaročwajem.

Zakazy treba adresawać tolki da firmy: „Łódzko-Bielska Tkanina" Łódź ul. św Andrzeja Nr 7, Oddział 10.

Uwaha: 6 sakawika 1934 h. abwieścim list našych klijentaū, katoryja biaspłatna atrymali premiju.

Dyk wykarystajcie hetuju wyniatkowuju akaziju.

Redaktar: Jan Paźniak Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1—3. Wydawiec: A. Šutowič